КОНТРОЛЬНЫ
ЭКЗЕМПЛЯР

Установа адукацыі
"Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка"

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Прарэктар па вучэбнай рабоце
_____________ А.В. Макоўчык
___ 2021 г.

Рэгістрацыйны № УД-51-8-11/вуч.

# ПРАКТЫКУМ ПА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ

Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі
па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасці:

**1 – 02 03 01 Беларуская мова і літаратура**

2021 г.

Вучэбная праграма распрацавана на аснове адукацыйнага стандарту вышэйшай адукацыі АСВА 1-02 03 01 тыпавой вучэбнай праграмы "Практыкум па беларускай мове", зацверджанай 18.11.2021г., рэгістрацыйны нумар ТД-А631/тып і вучэбнага плану 1-02 03 01 Беларуская мова і літаратура.

**СКЛАДАЛЬНІКІ**:
Т.А. Астапчык, выкладчык кафедры мовазнаўства і лінгвадыдактыкі ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка", кандыдат філалагічных навук;
М.В. Шабовіч, дацэнт кафедры мовазнаўства і лінгвадыдактыкі ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка", кандыдат філалагічных навук, дацэнт

**РЭЦЭНЗЕНТЫ**:
М.Р. Прыгодзіч, загадчык кафедры беларускага мовазнаўства Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, доктар філалагічных навук, прафесар

У.І. Куліковіч, загадчык кафедры рэдакцыйна-выдавецкіх тэхналогій ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт", кандыдат філалагічных навук, дацэнт.

**УЗГОДНЕНА**
Дырэктар ДУА
"Гімназія № 20 г. Мінска" Л.І. Абрамаў

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**
Кафедрай мовазнаўства і лінгвадыдактыкі ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка"
(пратакол № 12 ад 25.06.2021 г.)

Загадчык кафедры Д.В. Дзятко

Навукова-метадычным саветам ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка"
(пратакол № 4 ад 13.07. 2021 г.)

Афармленне вучэбнай праграмы і суправаджальных матэрыялаў дзеючым патрабаванням Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь адпавядае.

Метадыст вучэбна-метадычнага аддзела С.А. Старадуб

Дырэктар бібліятэкі Н. П. Сяткоўская

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Вучэбная праграма па дысцыпліне “Практыкум па беларускай мове” прызначана для рэалізацыі на першай ступені вышэйшай адукацыі ў межах цыклу спецыяльных дысцыплін. Ад папярэдняга тыпу вучэбнай праграмы яе адрозніваюць абноўлены і перакампанаваны змест, арыентацыя на кампетэнтнасны падыход у навучанні, значнае ўзмацненне ролі і часткі самастойнай работы студэнта, выкарыстанне сучасных інавацыйных педагагічных тэхналогій.

Курс “Практыкум па беларускай мове” выконвае спецыфічную ролю ў падрыхтоўцы спецыялістаў-філолагаў. З аднаго боку, ён сістэматызуе і паглыбляе веды, набытыя ў агульнаадукацыйнай школе, а з другога, рыхтуе першакурснікаў да ўспрымання цыклу лінгвістычных дысцыплін, у першую чаргу, “Сучаснай беларускай літаратурнай мовы”. Гэтым вызначаюцца мэты і задачы курса.

**Асноўныя мэты выкладання дысцыпліны:**

– удасканаліць філалагічнае мысленне студэнтаў;

– павысіць пісьменнасць студэнтаў, культуру іх мовы;

– развіць маўленчыя ўменні і навыкі;

– выхаваць любоў і павагу да мастацкага слова, духоўнай і інтэлектуальнай спадчыны беларускага народа, пачуццё нацыянальнай годнасці.

**Задачы вывучэння дысцыпліны:**

– сістэматызаваць і паглыбіць веды, атрыманыя ў агульнаадукацыйнай школе;

– падрыхтаваць да ўспрымання цыкла лінгвістычных дысцыплін і найперш да курса “Сучасная беларуская літаратурная мова”;

– навучыць абагульняць моўныя факты і з’явы;

– удасканаліць навыкі аналізу слова, словазлучэння і сказа;

– пазнаёміць з найбольш складанымі пытаннямі беларускага правапісу і пунктуацыі;

– развіваць маўленне студэнтаў;

– практыкаваць складанне картатэкі моўных фактаў з твораў беларускіх пісьменнікаў – прызнаных майстроў слова;

– навучыць афармляць асноўныя афіцыйна-справавыя паперы: заяву, даверанасць, аўтабіяграфію, пратакол, распіску і інш.;

– выпрацаваць устойлівыя навыкі і ўменні арфаграфічнай і пунктуацыйнай пісьменнасці.

*Месца вучэбнай дысцыпліны ў шэрагу іншых дысцыплін*

Сярод лінгвістычных дысцыплін, якія выкладаюцца на філалагічных факультэтах ВНУ Рэспублікі Беларусь, “Практыкум па беларускай мове” займае адно з найважнейшых месцаў у сістэме падрыхтоўкі настаўнікаў-філолагаў і выконвае спецыфічную ролю ў падрыхтоўцы спецыялістаў-філолагаў. З аднаго боку, ён сістэматызуе і паглыбляе веды, набытыя ў агульнаадукацыйнай школе, а з другога, рыхтуе першакурснікаў да ўспрымання цыклу лінгвістычных дысцыплін, у першую чаргу, “Сучаснай беларускай літаратурнай мовы”.

*Сувязь вучэбнай дысцыпліны з іншымі дысцыплінамі*

Вучэбная дысцыпліна “Практыкум па беларускай мове” звязана з такой вучэбнай дысцыплінай, як “Сучасная беларуская літаратурная мова”.

У выніку вывучэння дысцыпліны студэнт павінен:

**ведаць:**

– сістэму лексічных, фанетычных і граматычных асаблівасцей беларускай літаратурнай мовы;

– спецыфічныя рысы беларускай літаратурнай мовы;

– нормы сучаснай беларускай літаратурнай мовы;

– правілы арфаграфіі і пунктуацыі;

**умець:**

– прытрымлівацца нормаў сучаснай беларускай літаратурнай мовы;

– адбіраць, аналізаваць і сістэматызаваць моўны матэрыял;

– праводзіць лінгвістычныя назіранні, рабіць абагульненні і вывады;

– складаць (па зададзеных параметрах) і аналізаваць тэкст (вызначаць тэму, асноўную думку, тып і стыль тэксту, яго структурныя і моўныя асаблівасці);

– заўважаць, кваліфікаваць і выпраўляць памылкі;

– карыстацца лінгвістычнымі і энцыклапедычнымі слоўнікамі;

– складаць картатэку моўных фактаў;

– афармляць афіцыйна-справавыя паперы;

**валодаць:**

– нормамі сучаснай беларускай мовы;

– асновамі культуры беларускага маўлення, якое ажыццяўляецца ў вуснай і пісьмовай формах;

– навыкамі лінгвістычнага разбору моўных адзінак на ўсіх узроўнях моўнай сістэмы;

– навыкамі маўленча-камунікатыўнай дзейнасці.

***Базавая прафесійная кампетэнцыя*** наступная:

БПК-11: Прымяняць лексічныя, арфаэпічнымя, арфаграфічныя, граматычныя нормы сучаснай беларускай мовы на практыцы.

## Структура зместу вучэбнай дысцыпліны

Вывучэнне дысцыпліны “Практыкум па беларускай мове” разлічана на 180 вучэбных гадзін, з якіх 100 – аўдыторныя (усе заняткі практычныя), а 80 гадзін адводзіцца на самастойную працу студэнтаў.

У аснову структуравання зместу вучэбнага матэрыялу дысцыпліны пакладзены прынцып тэматычнага падыходу, які прадугледжвае падзел вучэбнага матэрыялу на адносна самастойныя раздзелы (тэмы).

Па кожнай вучэбнай тэме ў адпаведнасці з яе мэтамі і задачамі па фарміраванні і развіцці ў студэнтаў канкрэтных кампетэнцый выкладчык (кафедра) праектуе і рэалізуе канкрэтныя педагагічныя тэхналогіі.

Найбольш перспектыўныя і эфектыўныя сучасныя інавацыйныя адукацыйныя сістэмы і тэхналогіі наступныя: вучэбна-метадычны комплекс, блочна-модульная, модульна-рэйтынгавая і крэдытная сістэмы, інфармацыйныя тэхналогіі, методыкі актыўнага навучання.

Структура зместу вучэбнай дысцыпліны ўключае ўводзіны і вучэбныя раздзелы (тэмы). Тэматычны змест вучэбнай дысцыпліны рэалізуецца ў наступных формах: практычныя заняткі, самастойная праца студэнтаў.

Форма атэстацыі: 1 семестр – ***залік***, 2 семестр – ***залік***.

*Размеркаванне гадзін на дзённым аддзяленні на 1 курсе:*

| семестр | усяго гадзін | аўдыторныя | лекцыі | практычныя | самаст. праца | форма кантролю |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 90 | 50 | - | 50 | 40 | залік |
| 2 | 90 | 50 | - | 50 | 40 | залік |

# ЗМЕСТ ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ

## 1. УВОДЗІНЫ

Змест і задачы курса “Практыкум па беларускай мове”, яго месца ў сістэме лінгвістычных дысцыплін. Роля курса ў фарміраванні і развіцці сацыяльна-асобасных і сацыяльна-прафесійных кампетэнцый выпускнікоў ВНУ.

Нарматыўнасць літаратурнай мовы. Кадыфікацыя. Літаратурная норма (лексічныя, арфаэпічныя, акцэнталагічныя, марфалагічныя, арфаграфічныя, сінтаксічныя нормы). Адхіленні ад літаратурных нормаў і іх прычыны. Захаванне і пашырэнне нормаў літаратурнай мовы.

Патрабаванні арфаграфічнага рэжыму. Паняцце пра культуру маўлення.

Літаратурная мова як сістэма функцыянальных стыляў. Функцыянальна-стылявая дыферэнцыяцыя беларускай літаратурнай мовы (гутарковы, навуковы, публіцыстычны, афіцыйны, мастацкі стылі). Характэрныя рысы функцыянальных стыляў мовы. Моўныя штампы і канцылярызмы, іх ужыванне ў розных стылях мовы. Багацце сродкаў выражэння, мілагучнасць і вобразнасць беларускай мовы.

## 2. СЛОВА, ФРАЗЕАЛАГІЗМ

Асноўныя правілы слова- і фразеўжывання. Сутнасць слова, яго месца сярод іншых адзінак мовы, значэнне і паняцце, суадносіны лексічнага і граматычнага значэнняў у слове. Крытэрыі вылучэння слова. Лексема. Словаформа.

Прамое і пераноснае значэнні слоў. Метафара, метанімія, сінекдаха.

Полісемія. Размежаванне мнагазначных слоў і амонімаў. Амонімы як стылістычны сродак стварэння каламбураў. Паронімы. Стылістычныя памылкі, звязаныя з ужываннем амонімаў і паронімаў.

Сінонімы, іх функцыя ў мове. Сінанімічны рад. Лексічныя дублеты (абсалютныя сінонімы). Антанімія. Антонімы як лексічная аснова стылістычных фігур кантрасту (антытэза, аксюмаран). Лексічная інтэрферэнцыя.

Тэрміналагічная лексіка. Крыніцы фарміравання беларускай тэрміналогіі. Сувязь тэрміналагічнай лексікі з агульнаўжывальнай. Функцыянальныя і фармальна-граматычныя асаблівасці тэрмінаў. Паняцце пра тэрміназнаўства. Асноўныя прычыны запазычвання тэрмінаў. Асваенне іншамоўных тэрмінаў беларускай мовай.

Лексічны аналіз.

Фразеалагічныя адзінкі і іх ужыванне ў мове. Асаблівасці фразем. Фразеалагізм і слова. Фразеалагізм і словазлучэнне. Фразеалагізм і сказ. Крытэрыі фразеалагічнасці. Перыфраза.

Афарызмы. Крылатыя словы.

Паняцце пра фразеаграфію.

Фразеалагічны аналіз. Нацыянальна-культурная семантыка фразеалагічных адзінак. Праблемы перакладу фразеалагізмаў.

Энцыклапедычныя і лінгвістычныя слоўнікі (даведнікі); іх прызначэнне. Структура слоўнікавага артыкула. Тыпы дэфініцый. Сістэма граматычных і стылістычных памет.

## 3. ФАНЕТЫКА, АРФАЭПІЯ, ГРАФІКА, АРФАГРАФІЯ

Сістэма гукаў. Акустычны аспект вывучэння гукаў. Фізічныя ўласцівасці гукаў (сіла, вышыня, працягласць). Тоны і шумы. Тэмбр як адметная афарбоўка гука.

Галосныя і зычныя гукі і іх характарыстыка. Вакалізм. Класіфікацыя галосных гукаў (паводле ступені і месца пад'ёму языка, удзелу губ). Кансанантызм. Класіфікацыя зычных гукаў (паводле ўдзелу голасу і шуму, спосабу і месца ўтварэння, адсутнасці або наяўнасці палаталізацыі, працягласці). Асаблівасці фанетыкі беларускай мовы (аканне, яканне, дзеканне, цеканне, прыстаўныя, падоўжаныя гукі і інш.) у параўнанні з рускай мовай і правілы перадачы іх на пісьме. Чаргаванні гукаў (жывыя (пазіцыйныя) і гістарычныя (традыцыйныя)).

Фанетычны аналіз слова.

Гукі і літары. Алфавіт. Суадносіны паміж літарамі і гукамі. Абазначэнне мяккасці зычных на пісьме.

Асноўныя правілы вымаўлення галосных, зычных і спалучэнняў зычных. Асноўныя прычыны парушэння арфаэпічных нормаў. Маўленчая культура носьбіта мовы.

Асноўныя прынцыпы беларускай арфаграфіі. Змены і ўдакладненні ў беларускім правапісе (Закон «Аб Правілах беларускай арфаграфіі і пунктуацыі» ад 23 ліпеня 2008 года (уступіў у сілу 1 верасня 2010 года)). Правапіс галосных *о, э, а*; *е, ё, я*. Правапіс спалучэнняў *іо (ыо), іё (ыё), ія (ыя), іе (ые)* у запазычаных словах. Правапіс *у, ў*. Правапіс д-дз, т-ц.

Правапіс літар, якія абазначаюць глухія і звонкія, шыпячыя і свісцячыя зычныя. Новае ў правапісе галосных, спалучэнняў галосных і зычных (пасля прыняцця Закона «Аб Правілах беларускай арфаграфіі і пунктуацыі» ад 23 ліпеня 2008 года (уступіў у сілу 1 верасня 2010 года)).

Правапіс змякчальнага і раздзяляльнага мяккага знака і апострафа.

Напісанне слоў разам, праз злучок і асобна.

Ужыванне вялікай літары. Агульныя правілы правапісу вялікаи□ і малои□ літар. Новае ў правапісе вялікай і малой літар (пасля прыняцця Закона «Аб Правілах беларускай арфаграфіі і пунктуацыі» ад 23 ліпеня 2008 года (уступіў у сілу 1 верасня 2010 года)).

Правілы пераносу слоў. Правілы скарачэння слоў.

Арфаграфічны аналіз.

## 4. МАРФЕМНАЯ СТРУКТУРА СЛОВА, СЛОВАЎТВАРЭННЕ І ПРАВАПІС

Аснова слова і канчатак. Невытворныя і вытворныя асновы. Аснова словазмянення і формаўтварэння. Словаўтваральная аснова.

Корань, варыянты кораня (свабодныя і звязаныя карані); афіксы: прыстаўка, суфікс, постфікс, інтэрфікс. Тыпы афіксаў паводле функцыі: словаўтваральныя, формаўтваральныя і сінкрэтычныя (словаформаўтваральныя). Афіксоіды. Правапіс прыставак. Правапіс *і, ы, й* пасля прыставак.

Марфемны аналіз. Спосабы ўтварэння слоў (марфалагічны (афіксацыя, кампазіцыя, кампазіцыя+афіксацыя), марфалагічна-сінтаксічны, лексічна-сінтаксічны, лексіка-семантычны). Вытворнае слова. Словаўтваральны ланцужок. Словаўтваральнае значэнне.

Правапіс галосных у складаных словах, правапіс складанаскарочаных слоў. Напісанне абрэвіятур. Новае ў правапісе галосных у складаных словах (пасля прыняцця Закона «Аб Правілах беларускай арфаграфіі і пунктуацыі» ад 23 ліпеня 2008 года (уступіў у сілу 1 верасня 2010 года)).

Словаўтваральны аналіз.

## 5. МАРФАЛОГІЯ І ПРАВАПІС

Часціны мовы. Прынцыпы класіфікацыі слоў па часцінах мовы. Пераходнасць у сістэме часцін мовы. Зменлівасць часцін мовы. Самастойныя і службовыя часціны мовы. Марфалагічны аналіз слоў розных часцін мовы.

Назоўнік. Катэгарыяльнае значэнне прадметнасці ў назоўнікаў. Лексічна-семантычныя групы назоўнікаў. Лексіка-граматычныя разрады назоўнікаў. Марфалагічны аналіз назоўнікаў. Правапіс склонавых канчаткаў назоўнікаў першага скланення (у давальным і месным склонах). Правапіс склонавых канчаткаў назоўнікаў другога скланення (у родным і месным склонах). Правапіс склонавых канчаткаў назоўнікаў трэцяга скланення. Правапіс канчаткаў назоўнікаў множнага ліку. Правапіс канчаткаў рознаскланяльных назоўнікаў. Нескланяльныя назоўнікі. Скланенне імёнаў, прозвішчаў, геаграфічных назваў. Правапіс суфіксаў назоўнікаў. Правапіс складаных назоўнікаў. Формы назоўнікаў з суфіксамі суб'ектыўнай ацэнкі. Словаўтварэнне назоўнікаў. Субстантывацыя.

Прыметнік. Катэгарыяльнае значэнне прыметы ў прыметнікаў. Разрады прыметнікаў. Марфалагічны аналіз прыметнікаў. Утварэнне і ўжыванне формаў ступеняў параўнання якасных прыметнікаў. Форма элятыва. Выражэнне прыналежнасці ў беларускай мове. Уласнапрыналежныя і агульнапрыналежныя прыметнікі. Пераход прыметнікаў з аднаго тыпу ў іншы. Правапіс суфіксаў прыметнікаў. Правапіс складаных прыметнікаў. Кароткая і сцягнутая формы прыметнікаў. Формы прыметнікаў са значэннем суб'ектыўнай ацэнкі і меры якасці. Словаўтварэнне прыметнікаў. Ад'ектывацыя.

Лічэбнік. Катэгарыяльнае значэнне колькасці ў лічэбнікаў. Марфалагічны аналіз лічэбнікаў. Паняцце пра колькасна-іменнае спалучэнне. Адрозненне лічэбнікаў ад назоўнікаў са значэннем ліку *(двойка, тройка, сотня, трэць і інш.).* Скланенне і правапіс колькасных і парадкавых лічэбнікаў. Асаблівасці сінтаксічнай сувязі лічэбнікаў з назоўнікамі. Няпэўна-колькасныя словы.

Займеннік. Марфалагічны аналіз займеннікаў. Займеннікі як самая ўжывальная ў мове група слоў. Разрады займеннікаў. Асаблівасці ўжывання некаторых займеннікаў. Скланенне і правапіс займеннікаў. Словаўтварэнне займеннікаў. Пранаміналізацыя.

Дзеяслоў. Дзеяслоў як самая багатая на граматычныя катэгорыі часціна мовы. Катэгарыяльнае значэнне працэсу ў дзеясловаў. Марфалагічны аналіз

дзеясловаў. Інфінітыў. Асабовыя канчаткі дзеясловаў і іх правапіс. Адрозненне формы дзеясловаў 1-й асобы множнага ліку абвеснага ладу ад формы 1-й асобы загаднага ладу (*бяром – бярэм, нясём – нясем, сцеражом – сцеражэм*). Формы дзеясловаў 2-й асобы множнага ліку абвеснага ладу з націскнымі канчаткамі (*берацe, ідзяце, сцеражаце*). Вызначэнне націску ў дзеясловах 2-й асобы множнага ліку. Правапіс суфіксаў дзеясловаў. Словаўтварэнне дзеясловаў.

Дзеепрыметнік як форма дзеяслова. Спалучэнне асаблівасцей дзеяслова і прыметніка ў дзеепрыметніку. Марфалагічны аналіз дзеепрыметнікаў. Утварэнне і ўжыванне дзеепрыметнікаў. Правапіс суфіксаў дзеепрыметнікаў. Поўныя і кароткія дзеепрыметнікі. Дзеепрыметны зварот. Пераклад дзеепрыметнікаў з рускай мовы на беларускую. Сістэма сродкаў замены не ўласцівых беларускай мове дзеепрыметнікаў пры перакладзе з рускай мовы. Пераход дзеепрыметнікаў у прыметнікі.

Дзеепрыслоўе як форма дзеяслова. Спалучэнне асаблівасцей дзеяслова і прыслоўя ў дзеепрыслоўі. Марфалагічны аналіз дзеепрыслоўяў. Утварэнне і ўжыванне дзеепрыслоўяў. Дзеепрыслоўны зварот. Правапіс суфіксаў дзеепрыслоўяў. Пераход дзеепрыслоўяў у прыслоўі.

П р ы с л о ў е. Нязменнасць як асноўная марфалагічная прымета прыслоўя. Марфалагічны аналіз прыслоўяў. Утварэнне і ўжыванне формаў ступеняў параўнання якасных прыслоўяў. Правапіс прыслоўяў. Правапіс спалучэнняў, блізкіх да прыслоўяў. Формы прыслоўяў са значэннем ацэнкі і меры якасці. Невытворныя і вытворныя прыслоўі. Адвербіялізацыя. Безасабова-прэдыкатыўныя словы. Адрозненне прыслоўяў ад безасабова-прэдыкатыўных слоў.

С л у ж б о в ы я  ч а с ц і н ы  м о в ы  і  в ы к л і ч н і к. Марфалагічны аналіз прыназоўнікаў, злучнікаў, часціц. Правапіс прыназоўнікаў. Адрозненне прыназоўнікаў ад слоў іншых граматычна-семантычных класаў. Асаблівасці ўжывання прыназоўнікаў у беларускай мове. Правапіс злучнікаў. Адрозненне злучнікаў ад слоў іншых часцін мовы. Правапіс часціц. Правапіс *не* (*ня*), *ні* з рознымі часцінамі мовы. Ужыванне часціц *не* і *ні*. Выкарыстанне часціц у словаўтварэнні.

Адметнасць выклічніка як часціны мовы. Марфалагічны аналіз выклічнікаў. Адрозненне выклічнікаў ад самастойных і службовых часцін мовы. Адрозненне гукапераймальных слоў ад выклічнікаў. Правапіс выклічнікаў і гукапераймальных слоў і знакі прыпынку пры іх. Гукаперайманні як аснова для ўтварэння новых слоў.

Мадальныя словы. Месца мадальных слоў у сістэме часцін мовы.

## 6. СІНТАКСІС І ПУНКТУАЦЫЯ

С л о в а з л у ч э н н е. Прыметы словазлучэння. Адрозненне словазлучэння ад слова і сказа. Свабодныя і несвабодныя словазлучэнні. Віды сувязі слоў у словазлучэнні. Ужыванне прыназоўнікавых канструкцый. Асаблівасці кіравання ў беларускай мове (у параўнанні з рускай). Спецыфічныя словазлучэнні ў беларускай мове. Сінтаксічны аналіз словазлучэння.

П р о с т ы  с к а з . Прыметы сказа (граматычная афармленасць, прэдыкатыўнасць, мадальнасць, сэнсавая завершанасць, інтанацыйная закончанасць). Сказ як адзінка найвышэйшага сінтаксічнага ўзроўню мовы. Камунікатыўная функцыя сказа. Сінтаксічны аналіз простага сказа. Двухсастаўныя і аднасастаўныя сказы. Няпоўныя сказы. Словы-сказы. Галоўныя і даданыя члены сказа, іх выражэнне. Марфалагізаваныя і немарфалагізаваныя члены сказа. Каардынацыя дзейніка і выказніка. Размежаванне членаў сказа. Дапаўненне. Азначэнне. Прыдатак як разнавіднасць дапасаванага азначэння. Сінкрэтызм у сістэме даданых членаў сказа. Парадак слоў у сказе. Інверсія і яе стылістычная роля.

Працяжнік паміж дзейнікам і выказнікам. Працяжнік у няпоўным сказе.

Аднародныя члены сказа. Прыметы аднароднасці членаў сказа. Віды сувязі паміж аднароднымі членамі сказа. Аднародныя і неаднародныя азначэнні. Абагульняльныя словы пры аднародных членах сказа. Знакі прыпынку пры аднародных членах сказа.

Адасабленне як спецыфічны сродак сінтаксічнай сувязі слоў у сказе. Сказы з адасобленымі членамі. Адасобленыя азначэнні. Адасобленыя прыдаткі. Адасобленыя дапаўненні. Адасобленыя акалічнасці. Адасабленне далучальных канструкцый. Факультатыўнае адасабленне даданых членаў сказа.

Знакі прыпынку пры параўнальных зваротах. Адрозненне параўнальнага звароту ад даданай параўнальнай часткі складаназалежнага сказа.

Пабочныя і ўстаўныя канструкцыі. Адрозненне пабочных канструкцый ад аманімічных непабочных. Адрозненне ўстаўных канструкцый ад іншых сінтаксічных адзінак. Знакі прыпынку пры пабочных і ўстаўных канструкцыях.

Зваротак. Спосабы выражэння звароткаў. Знакі прыпынку пры звароткаў, якія стаяць у пачатку, у сярэдзіне і ў канцы сказа. Знакі прыпынку пры звароткаў, якія ўжываюцца з часціцамі і асабовымі займеннікамі.

Парцэляцыя як сінтаксічная з'ява.

С к л а д а н ы  с к а з . Сінтаксічны аналіз складанага сказа. Тыпы складаных сказаў. Сродкі выражэння сувязі і адносін паміж часткамі складанага сказа.

Тыпы складаназлучаных сказаў і знакі прыпынку ў іх. Адрозненне злучнікаў і злучальных слоў.

Тыпы складаназалежных сказаў і знакі прыпынку ў іх. Знакі прыпынку ў складаназалежных сказах з некалькімі даданымі.

Тыпы бяззлучнікавых складаных сказаў, знакі прыпынку ў іх.

Складаныя сказы з рознымі відамі сувязі, знакі прыпынку ў іх.

Перыяд. Складанае сінтаксічнае цэлае.

П р о с т а я  і  ў с к о с н а я  м о в а . Формы простай мовы (рэпліка, маналог, дыялог, палілог). Аўтарская і простая мова. Знакі прыпынку ў сказах з простай мовай. Афармленне дыялога. Змены пры трансфармацыі сказа з простай мовай у сказ з ускоснай мовай. Паўпростая мова. Няўласна-простая мова. Знакі прыпынку пры цытаванні.

П у н к т у а ц ы я . Роля пунктуацыі ў афармленні пісьмовай мовы. Інтанацыя як дадатковы паказчык ужывання знакаў прыпынку. Знакі прыпынку і іх тыпы (выдзяляльныя, раздзяляльныя, поліфункцыянальныя). Спалучэнне знакаў

прыпынку і “паглынанне” адных знакаў другімі. Нарматыўныя, варыянтныя, факультатыўныя, аўтарскія знакі прыпынку. Мнагазначнасць знакаў прыпынку.

Пунктуацыйны аналіз.

## 7. АФІЦЫЙНЫЯ ПАПЕРЫ

Віды афіцыйных папер і агульныя патрабаванні да іх. Уніфікацыя і стандартызацыя службовых папер. Афармленне і напісанне заявы, распіскі, акта, даверанасці, аўтабіяграфіі, пратакола і інш. Рэгламентацыя лексічных і сінтаксічных сродкаў афіцыйнага стылю.

# ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ

| № п/п | Назва раздзела (модуля), тэмы | Кол-сць аўдыторных гадзін: Практычныя заняткі | Самастойная праца студэнтаў | Літаратура | Формы кантролю ведаў |
|---|---|---|---|---|---|
| | **ПРАКТЫКУМ ПА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ (180 г.).** | **100** | **80** | | |
| **1.** | **Уводзіны (2 г.)** | **2** | **2** | | |
| 1.1.<br>1.2.<br>1.3.<br>1.4. | Змест і задачы курса “Практыкум па беларускай мове”, яго месца ў сістэме лінгвістычных дысцыплін. Роля курса ў фарміраванні і развіцці сацыяльна-асобасных і сацыяльна-прафесійных кампетэнцый выпускнікоў ВНУ.<br>Нарматыўнасць літаратурнай мовы. Кадыфікацыя. Літаратурная норма (лексічныя, арфаэпічныя, акцэнталагічныя, марфалагічныя, арфаграфічныя, сінтаксічныя нормы). Адхіленні ад літаратурных нормаў і іх прычыны. Захаванне і пашырэнне нормаў літаратурнай мовы.<br>Патрабаванні арфаграфічнага рэжыму. Паняцце пра культуру маўлення.<br>Літаратурная мова як сістэма функцыянальных стыляў. Функцыянальна-стылявая дыферэнцыяцыя беларускай літаратурнай мовы (гутарковы, навуковы, публіцыстычны, афіцыйны, мастацкі стылі). Характэрныя рысы функцыянальных стыляў мовы. Моўныя штампы і канцылярызмы, іх ужыванне ў розных стылях мовы. Багацце сродкаў выражэння, мілагучнасць і вобразнасць беларускай мовы. | 2 | 2 | 1, 2, 3, 6, 11 | Вусныя паведамленні, франтальнае апытванне |
| **2.** | **Слова, фразеалагізм (8 г.)** | **8** | **8** | | |
| 2.1.<br>2.2. | Асноўныя правілы слова- і фразеўжывання. Сутнасць слова, яго месца сярод іншых адзінак мовы, значэнне і паняцце, суадносіны лексічнага і граматычнага значэнняў у слове. Крытэрыі вылучэння слова. Лексема. Словаформа.<br>Прамое і пераноснае значэнні слоў. Метафара, метанімія, сінекдаха. | 2 | 2 | 1, 2, 3, 8, 10 | Выкананне вусных і пісьмовых практыкаванняў |

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| 2.3.<br>2.4. | Полісемія. Размежаванне мнагазначных слоў і амонімаў. Амонімы як стылістычны сродак стварэння каламбураў. Паронімы. Стылістычныя памылкі, звязаныя з ужываннем амонімаў і паронімаў.<br>Сінонімы, іх функцыя ў мове. Сінанімічны рад. Лексічныя дублеты (абсалютныя сінонімы). Антанімія. Антонімы як лексічная аснова стылістычных фігур кантрасту (антытэза, аксюмаран). Лексічная інтэрферэнцыя. | 2 | 2 | 1, 3, 8, 11 | Ушчыльненае апытванне |
| 2.5.<br>2.6. | Тэрміналагічная лексіка. Крыніцы фарміравання беларускай тэрміналогіі. Сувязь тэрміналагічнай лексікі з агульнаўжывальнай. Функцыянальныя і фармальна-граматычныя асаблівасці тэрмінаў. Паняцце пра тэрміназнаўства. Асноўныя прычыны запазычвання тэрмінаў. Асваенне іншамоўных тэрмінаў беларускай мовай.<br>Лексічны аналіз. | 2 | 2 | 1, 3, 6, 9, 11 | Праца са слоўнікамі, падрыхтоўка рэфератаў |
| 2.7.<br>2.8.<br>2.9.<br>2.10. | Фразеалагічныя адзінкі і іх ужыванне ў мове. Асаблівасці фразем. Фразеалагізм і слова. Фразеалагізм і словазлучэнне. Фразеалагізм і сказ. Крытэрыі фразеалагічнасці. Перыфраза. Паняцце пра фразеаграфію.<br>Афарызмы. Крылатыя словы.<br>Фразеалагічны аналіз. Нацыянальна-культурная семантыка фразеалагічных адзінак. Праблемы перакладу фразеалагізмаў.<br>Энцыклапедычныя і лінгвістычныя слоўнікі (даведнікі); іх прызначэнне. Структура слоўнікавага артыкула. Тыпы дэфініцый. Сістэма граматычных і стылістычных памет. | 2 | 2 | 1, 2, 3, 7, 8, 9, 10 | Праца са слоўнікамі, падрыхтоўка рэфератаў |
| **3.** | **Фанетыка, арфаэпія, графіка, арфаграфія (18 г.).** | **18** | **14** | | |
| 3.1.<br>3.2. | Сістэма гукаў. Акустычны аспект вывучэння гукаў. Фізічныя ўласцівасці гукаў (сіла, вышыня, працягласць). Тоны і шумы. Тэмбр як адметная афарбоўка гука.<br>Галосныя і зычныя гукі і іх характарыстыка. Вакалізм. Класіфікацыя галосных гукаў (паводле ступені і месца пад’ёму языка, удзелу губ). | 2 | 2 | 1, 2, 3, 8, 9, 13 | Вусныя практыкаванні, заданні на картках |
| 3.3. | Кансанантызм. Класіфікацыя зычных гукаў (паводле ўдзелу голасу і шуму, спосабу і месца ўтварэння, адсутнасці або наяўнасці палаталізацыі, працягласці). | 2 | 2 | 1, 2, 3, 8, 9, 13 | Індывідуальнае апытванне |
| 3.4. | Асаблівасці фанетыкі беларускай мовы (аканне, яканне, дзеканне, цеканне, прыстаўныя, падоўжаныя гукі і інш.) у параўнанні з рускай мовай і правілы перадачы іх на пісьме. Чаргаванні гукаў (жывыя (пазіцыйныя) і гістарычныя (традыцыйныя)). Фанетычны аналіз слова. | 2 | 2 | 1, 2, 3, 8, 9, 13 | Ушчыльненае апытванне |

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| 3.5.<br>3.6 | Гукі і літары. Алфавіт. Суадносіны паміж літарамі і гукамі. Абазначэнне мяккасці зычных на пісьме.<br>Асноўныя правілы вымаўлення галосных, зычных і спалучэнняў зычных. Асноўныя прычыны парушэння арфаэпічных нормаў. Маўленчая культура носьбіта мовы. | 2 | 2 | 1, 2, 3, 8, 9, 13, 16 | Вусныя і пісьмовыя практыкаванні па тэме |
| 3.7. | Асноўныя прынцыпы беларускай арфаграфіі. Змены і ўдакладненні ў беларускім правапісе (Закон «Аб Правілах беларускай арфаграфіі і пунктуацыі» ад 23 ліпеня 2008 года (уступіў у сілу 1 верасня 2010 года)). Асноўныя прынцыпы беларускай арфаграфіі. Змены і ўдакладненні ў беларускім правапісе (Закон «Аб Правілах беларускай арфаграфіі і пунктуацыі» ад 23 ліпеня 2008 года (уступіў у сілу 1 верасня 2010 года)). Правапіс галосных *о, э, а*; *е, ё, я*. Правапіс спалучэнняў *іо (ыо), іё (ыё), ія (ыя), іе (ые)* у запазычаных словах. Правапіс *у, ў*. Правапіс д-дз, т-ц. | 2 | 2 | 1, 3, 5, 13 | Заданні на картках |
| 3.8. | Правапіс літар, якія абазначаюць глухія і звонкія, шыпячыя і свісцячыя зычныя. Новае ў правапісе галосных, спалучэнняў галосных і зычных (пасля прыняцця Закона «Аб Правілах беларускай арфаграфіі і пунктуацыі» ад 23 ліпеня 2008 года (уступіў у сілу 1 верасня 2010 года)). | 2 | 2 | 1, 3, 5, 13 | Тэставыя заданні |
| 3.9. | Правапіс змякчальнага і раздзяляльнага мяккага знака і апострафа. | 2 | | 1, 3, 5, 13 | Тэставыя заданні |
| 3.10 | Напісанне слоў разам, праз злучок і асобна. | 2 | | 1, 3, 5, 13 | Пісьмовая праца |
| 3.11<br>3.12 | Ужыванне вялікай літары. Агульныя правілы правапісу вялікай і малой літар. Новае ў правапісе вялікай і малой літар (пасля прыняцця Закона «Аб Правілах беларускай арфаграфіі і пунктуацыі» ад 23 ліпеня 2008 года (уступіў у сілу 1 верасня 2010 года)).<br>Правілы пераносу слоў. Правілы скарачэння слоў. Арфаграфічны аналіз. | 2 | 2 | 1, 3, 5, 13 | Выкананне пісьмовых практыкаванняў |
| **4.** | **Марфемная структура слова, словаўтварэнне і правапіс (6 г.)** | **6** | **6** | | |
| 4.1.<br>4.2. | Аснова слова і канчатак. Невытворныя і вытворныя асновы. Аснова словазмянення і формаўтварэння. Словаўтваральная аснова.<br>Корань, варыянты кораня (свабодныя і звязаныя карані); афіксы: прыстаўка, суфікс, постфікс, інтэрфікс. Тыпы афіксаў паводле функцыі: словаўтваральныя, формаўтваральныя і сінкрэтычныя (словаформаўтваральныя). Афіксоіды. | 2 | 2 | 1, 2, 3, 9 | Ушчыльненае апытванне, праца са слоўнікамі |

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| 4.3. | Правапіс прыставак. Правапіс *і, ы, й* пасля прыставак. Марфемны аналіз. Спосабы ўтварэння слоў (марфалагічны (афіксацыя, кампазіцыя, кампазіцыя+афіксацыя), марфалагічна-сінтаксічны, лексічна-сінтаксічны, лексіка-семантычны). Вытворнае слова. Словаўтваральны ланцужок. Словаўтваральнае значэнне. | 2 | 2 | 1,2,3,9 | Выкананне практыкаванняў |
| 4.4.<br><br>4.5. | Правапіс галосных у складаных словах, правапіс складанаскарочаных слоў. Напісанне абрэвіятур. Новае ў правапісе галосных у складаных словах (пасля прыняцця Закона «Аб Правілах беларускай арфаграфіі і пунктуацыі» ад 23 ліпеня 2008 года (уступіў у сілу 1 верасня 2010 года)).<br>Словаўтваральны аналіз. | 2 | 2 | 1, 2, 3, 9 | Выкананне пісьмовых заданняў |
| **5.** | **Марфалогія і правапіс (40 г.).** | **40** | **32** | | |
| 5.1. | Часціны мовы. Прынцыпы класіфікацыі слоў па часцінах мовы. Пераходнасць у сістэме часцін мовы. Зменлівасць часцін мовы. Самастойныя і службовыя часціны мовы. Марфалагічны аналіз слоў розных часцін мовы. | 2 | 2 | 1, 2, 3, 9 | Падрыхтоўка вусных паведамленняў |
| 5.2. | Назоўнік. Катэгарыяльнае значэнне прадметнасці ў назоўнікаў. Лексічна-семантычныя групы назоўнікаў. Лексіка-граматычныя разрады назоўнікаў. Правапіс склонавых канчаткаў назоўнікаў першага скланення (у давальным і месным склонах). | 2 | 2 | 1, 2, 3 | Пісьмовыя заданні |
| 5.3. | Правапіс склонавых канчаткаў назоўнікаў другога скланення (у родным і месным склонах). Правапіс склонавых канчаткаў назоўнікаў трэцяга скланення. Правапіс канчаткаў назоўнікаў множнага ліку. | 2 | | 1, 2, 3 | Выкананне практыкаванняў |
| 5.4. | Рознаскланяльныя назоўнікі. Правапіс канчаткаў рознаскланяльных назоўнікаў. Нескланяльныя назоўнікі. Скланенне імёнаў, прозвішчаў, геаграфічных назваў. | 2 | 2 | 1, 2, 3, 7, 12 | Тэставыя заданні |
| 5.5. | Правапіс суфіксаў назоўнікаў. Правапіс складаных назоўнікаў. Формы назоўнікаў з суфіксамі суб'ектыўнай ацэнкі. Словаўтварэнне назоўнікаў. Субстантывацыя. Марфалагічны аналіз назоўнікаў. | 2 | 2 | 1, 2, 3, 9 | Франтальнае апытванне |

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| 5.6.<br>5.7. | П р ы м е т н і к . Катэгарыяльнае значэнне прыметы ў прыметнікаў. Разрады прыметнікаў. Марфалагічны аналіз прыметнікаў.<br>Утварэнне і ўжыванне формаў ступеняў параўнання якасных прыметнікаў. Форма элятыва. Выражэнне прыналежнасці ў беларускай мове. Уласнапрыналежныя і агульнапрыналежныя прыметнікі. Пераход прыметнікаў з аднаго тыпу ў іншы. | 2 | 2 | 1, 2, 3, 7 | Ушчыльненае апытванне |
| 5.8. | 5. 8. Правапіс суфіксаў прыметнікаў. Правапіс складаных прыметнікаў. Кароткая форма прыметнікаў. Сцягнутая форма прыметнікаў. Формы прыметнікаў са значэннем суб'ектыўнай ацэнкі і меры якасці. Словаўтварэнне прыметнікаў. Ад'ектывацыя. | 2 | 2 | 1, 2, 3, 7 | Падрыхтоўка вусных паведамленняў |
| 5.9. | Л і ч э б н і к . Катэгарыяльнае значэнне колькасці ў лічэбнікаў. Марфалагічны аналіз лічэбнікаў. Паняцце пра колькасна-іменнае спалучэнне. Адрозненне лічэбнікаў ад назоўнікаў са значэннем ліку *(двойка, тройка, сотня, трэць і інш.).* | 2 | 2 | 1, 2, 3, 9 | Ушчыльненае апытванне |
| 5.10. | Скланенне і правапіс колькасных і парадкавых лічэбнікаў. Асаблівасці сінтаксічнай сувязі лічэбнікаў з назоўнікамі. Пераход лічэбнікаў у іншыя часціны мовы. Няпэўна-колькасныя словы. | 2 | 2 | 1, 2, 3 | Франтальнае апытванне |
| 5.11. | З а й м е н н і к . Займеннікі як самая ўжывальная ў мове група слоў. Разрады займеннікаў. Асаблівасці ўжывання некаторых займеннікаў. Скланенне і правапіс займеннікаў. Словаўтварэнне займеннікаў. Пранаміналізацыя. Марфалагічны аналіз займеннікаў. | 2 | 2 | 1, 2, 3, 9 | Тэставыя заданні |
| | Д з е я с л о ў . Дзеяслоў як самая багатая на граматычныя катэгорыі часціна мовы. Катэгарыяльнае значэнне працэсу ў дзеясловаў. Марфалагічны аналіз дзеясловаў. Інфінітыў. Асабовыя канчаткі дзеясловаў і іх правапіс. | 2 | 2 | 1, 2, 3, 9 | Пісьмовыя практыкаванні |
| 5.12.<br>5.13. | Адрозненне формы дзеясловаў 1-й асобы множнага ліку абвеснага ладу ад формы 1-й асобы загаднага ладу дзеясловаў (*бяром – бярэм, нясём – нясем, сцеражом – сцеражэм*). Формы дзеясловаў 2-й асобы множнага ліку абвеснага ладу з націскнымі канчаткамі (*бераце, ідзяце, сцеражаце*). Вызначэнне націску ў дзеясловах 2-й асобы множнага ліку. Рознаспрагальныя дзеясловы. Правапіс суфіксаў дзеясловаў. Словаўтварэнне дзеясловаў. | 2 | | 1, 2, 3, 7 | Выкананне практыкаванняў |
| 5.14. | Дзеепрыметнік як форма дзеяслова. Спалучэнне асаблівасцей дзеяслова і прыметніка ў дзеепрыметніку. Марфалагічны аналіз дзеепрыметнікаў. Утварэнне і ўжыванне дзеепрыметнікаў. Правапіс суфіксаў дзеепрыметнікаў. | 2 | 2 | 1, 2, 3, 9 | Пераклад тэкстаў па спецыяльнасці з рускай мовы на беларускую |

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| 5.15. | Поўныя і кароткія дзеепрыметнікі. Дзеепрыметны зварот. Пераклад дзеепрыметнікаў з рускай мовы на беларускую. Сістэма сродкаў замены не ўласцівых беларускай мове дзеепрыметнікаў пры перакладзе з рускай мовы. Пераход дзеепрыметнікаў у прыметнікі. | 2 | 2 | 1, 2, 3, 7 | Заданні на картках |
| 5.16. | Дзеепрыслоўе як форма дзеяслова. Спалучэнне асаблівасцей дзеяслова і прыслоўя ў дзеепрыслоўі. Марфалагічны аналіз дзеепрыслоўяў. Утварэнне і ўжыванне дзеепрыслоўяў. Дзеепрыслоўны зварот. Правапіс суфіксаў дзеепрыслоўяў. Пераход дзеепрыслоўяў у прыслоўі і іншыя часціны мовы. | 2 | 2 | 1, 2, 3, 7, 9 | Пісьмовыя практыкаванні |
| 5.17. | П р ы с л о ў е . Нязменнасць як асноўная марфалагічная прымета прыслоўя. Марфалагічны аналіз прыслоўяў. Утварэнне і ўжыванне формаў ступеняў параўнання якасных прыслоўяў. Правапіс прыслоўяў. Правапіс спалучэнняў, блізкіх да прыслоўяў. | 2 | | 1, 2, 3, 6, 12 | Ушчыльненае апытванне |
| 5.18. | Формы прыслоўяў са значэннем ацэнкі і меры якасці. Невытворныя і вытворныя прыслоўі. Адвербіялізацыя. Безасабова-прэдыкатыўныя словы (словы катэгорыі стану). Адрозненне прыслоўяў ад безасабова-прэдыкатыўных слоў. | 2 | 2 | 1, 2, 3, 6, 12 | Заданні на картках |
| 5.19. | С л у ж б о в ы я ч а с ц і н ы м о в ы і в ы к л і ч н і к . Марфалагічны аналіз прыназоўнікаў, злучнікаў, часціц. Правапіс прыназоўнікаў. Адрозненне прыназоўнікаў ад слоў іншых граматычна-семантычных класаў. Асаблівасці ўжывання прыназоўнікаў у беларускай мове. Правапіс злучнікаў. Адрозненне злучнікаў ад слоў іншых часцін мовы | 2 | 2 | 1, 2, 3, 6, 9 | Тэставыя заданні |
| 5.20. | Правапіс часціц. Правапіс *не* (*ня*), *ні* з рознымі часцінамі мовы. Ужыванне часціц *не* і *ні*. Выкарыстанне часціц у словаўтварэнні. | 2 | | 1, 2, 3, 6 | Пісьмовая работа |
| 5.21. | Адметнасць выклічніка як часціны мовы. Марфалагічны аналіз выклічнікаў. Адрозненне выклічнікаў ад самастойных і службовых часцін мовы. Адрозненне гукапераймальных слоў ад выклічнікаў. Правапіс выклічнікаў і гукапераймальных слоў і знакі прыпынку пры іх. Гукаперайманні як аснова для ўтварэння новых слоў. Мадальныя словы. Месца мадальных слоў у сістэме часцін мовы. | 2 | 2 | 1, 2, 3, 6, 9 | Вусныя паведамленні |
| **6.** | **Сінтаксіс і пунктуацыя (24 г.)** | **24** | **16** | | |

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| 6. 1. | С л о в а з л у ч э н н е . Прыметы словазлучэння. Адрозненне словазлучэння ад слова і сказа. Свабодныя і несвабодныя словазлучэнні. Віды сувязі слоў у словазлучэнні. Ужыванне прыназоўнікавых канструкцый. Асаблівасці кіравання ў беларускай мове (у параўнанні з рускай). Спецыфічныя словазлучэнні ў беларускай мове. Сінтаксічны аналіз словазлучэння. | 2 | 2 | 1, 2, 4, 6, 9 | Пераклад тэкстаў па спецыяльнасці з рускай мовы на беларускую |
| 6 . 2 | . П р о с т ы с к а з . Прыметы сказа (граматычная афармленасць, прэдыкатыўнасць, мадальнасць, сэнсавая завершанасць, інтанацыйная закончанасць). Сказ як адзінка найвышэйшага сінтаксічнага ўзроўню мовы. Камунікатыўная функцыя сказа. Сінтаксічны аналіз простага сказа. Двухсастаўныя і аднасастаўныя сказы. Няпоўныя сказы. Словы-сказы. Галоўныя і даданыя члены сказа, іх выражэнне. Каардынацыя дзейніка і выказніка. Размежаванне членаў сказа. | 2 | 2 | 1, 2, 4, 6, 9 | Аналіз тэкстаў мастацкай літаратуры |
| 6 . 3 . | Д а п а ў н е н н е . А з н а ч э н н е . Прыдатак як разнавіднасць дапасаванага азначэння. Сінкрэтызм у сістэме даданых членаў сказа. Парадак слоў у сказе. Інверсія і яе стылістычная роля. Працяжнік паміж дзейнікам і выказнікам. Працяжнік у няпоўным сказе. | 2 | 2 | 1, 2, 4, 6 | Выкананне практыкаванняў |
| 6.4. | Аднародныя члены сказа. Прыметы аднароднасці членаў сказа. Віды сувязі паміж аднароднымі членамі сказа. Аднародныя і неаднародныя азначэнні. Абагульняльныя словы пры аднародных членах сказа. Знакі прыпынку пры аднародных членах сказа. | 2 | | 1, 2, 4, 6 | Заданні на картках |
| 6.5. | Адасабленне як спецыфічны сродак сінтаксічнай сувязі слоў у сказе. Сказы з адасобленымі членамі. Адасобленыя азначэнні. Адасобленыя прыдаткі. Адасобленыя дапаўненні. Адасобленыя акалічнасці. Адасабленне далучальных канструкцый. Факультатыўнае адасабленне даданых членаў сказа. | 2 | 2 | 1, 2, 4, 6 | Пісьмовыя практыкаванні |
| 6.6. | Знакі прыпынку пры параўнальных зваротах. Адрозненне параўнальнага звароту ад даданай параўнальнай часткі складаназалежнага сказа.<br>Пабочныя і ўстаўныя канструкцыі. Адрозненне пабочных канструкцый ад аманімічных непабочных. Адрозненне ўстаўных канструкцый ад іншых сінтаксічных адзінак. Знакі прыпынку пры пабочных і ўстаўных канструкцыях. | 2 | 2 | 1, 2, 4, 5, 6 | Дыктант |
| 6.7. | Зваротак. Спосабы выражэння звароткаў. Знакі прыпынку пры зваротках, якія стаяць у пачатку, у сярэдзіне і ў канцы сказа. Знакі прыпынку пры зваротках, якія ўжываюцца з часціцамі і асабовымі займеннікамі. Парцэляцыя як сінтаксічная з'ява. | 2 | | 1, 2, 4, 5, 6 | Пісьмовыя практыкаванні |

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| 6.8. | Складаны сказ. Сінтаксічны аналіз складанага сказа. Тыпы складаных сказаў. Сродкі выражэння сувязі і адносін паміж часткамі складанага сказа. Тыпы складаназлучаных сказаў і знакі прыпынку ў іх. Адрозненне злучнікаў і злучальных слоў. | 2 | | 1, 2, 4, 5, 6 | Аналіз тэкстаў мастацкай літаратуры |
| 6.9. | Тыпы складаназалежных сказаў і знакі прыпынку ў іх. Знакі прыпынку ў складаназалежных сказах з некалькімі дадатнымі/ | 2 | | 1, 2, 4, 5, 6 | Выкананне практыкаванняў |
| 6. 10. | Тыпы бяззлучнікавых складаных сказаў, знакі прыпынку ў іх. Складаныя сказы з рознымі відамі сувязі, знакі прыпынку ў іх. Перыяд. Складанае сінтаксічнае цэлае. | 2 | 2 | 1, 2, 4, 5, 6 | Заданні на картках |
| 6.1 1. | Простая і ўскосная мова. Формы простай мовы (рэпліка, маналог, дыялог, палілог). Аўтарская і простая мова. Знакі прыпынку ў сказах з простай мовай. Афармленне дыялога. Змены пры трансфармацыі сказа з простай мовай у сказ з ускоснай мовай. Паўпростая мова. Няўласна-простая мова. Знакі прыпынку пры цытаванні. | 2 | 2 | 1, 2, 4, 5, 6 | Праца з тэкстамі |
| 6.1 2. | Пунктуацыя. Роля пунктуацыі ў афармленні пісьмовай мовы. Інтанацыя як дадатковы паказчык ужывання знакаў прыпынку. Знакі прыпынку і іх тыпы (выдзяляльныя, раздзяляльныя, поліфункцыянальныя). Спалучэнне знакаў прыпынку і “паглынанне” адных знакаў другімі. Нарматыўныя, варыянтныя, факультатыўныя, аўтарскія знакі прыпынку. Мнагазначнасць знакаў прыпынку. Пунктуацыйны аналіз. | 2 | 2 | 1, 2, 4, 5, 6, 9 | Дыктант |
| **7.** | **Афіцыйныя паперы (2 г.)** | **2** | **2** | | |
| 7.1.<br><br>7.2. | Віды афіцыйных папер і агульныя патрабаванні да іх. Уніфікацыя і стандартызацыя службовых папер. Рэгламентацыя лексічных і сінтаксічных сродкаў афіцыйнага стылю.<br>Афармленне і напісанне заявы, распіскі, акта, даверанасці, аўтабіяграфіі, пратакола і інш. | 2 | 2 | 1, 2, 3 | Напісанне афіцыйных папер |
| | ***Усяго:*** | **100** | **80** | | **залік** |

# ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

## ЛІТАРАТУРА

**Асноўная літаратура**

1. Беларускі правапіс [Электронны рэсурс] : дапам. для студэнтаў, якія навучаюцца па спецыяльнасцях 1-02 03 01 «Беларуская мова і літаратура» 1-02 03 03 «Беларуская мова і літаратура», дадат. спецыяльнасць 1-02 03 07 «Замежная мова (англійская, нямецкая)», дадат. спецыяльнасць 1-02 03 07-01 «Замежная мова (англійская, нямецкая)», «Беларуская мова і літаратура» 1-02 03 04 «Руская мова і літаратура», дадат. спецыяльнасць 1-02 03 04-01 «Руская мова і літаратура. Беларуская мова і літаратура» / І. Л. Бурак [і інш.] // Репозиторий БГПУ. – Рэжым доступу: http://elib.bspu.by/handle/doc/48067. – Дата доступу: 31.05.2021.
2. Квяткоўскі, А. А. Беларуская мова: фанетыка, арфаэпія, арфаграфія. Склад слова і словаўтварэнне [Электронны рэсурс] : дапам. для слухачоў падрыхтоўчага аддз-ня і падрыхтоўчых курсаў / А. А. Квяткоўскі // Репозиторий БГПУ. – Рэжым доступу: http://elib.bspu.by/handle/doc/46855. – Дата доступу: 31.05.2021.
3. Солахаў, А. В. Сучасная беларуская літаратурная мова: віды лінгвістычнага аналізу : вучэб. дапам. для студэнтаў ВНУ / А. В. Солахаў. – Мінск : Нар. асвета, 2016. – 415 с.

**Дадатковая літаратура**

1. Арфаэпічны слоўнік беларускай мовы / уклад.: В. П. Русак [і інш.] ; рэдкал.: В. П. Русак [і інш.]. – Мінск : Беларус. навука, 2017. – 757 с.
2. Баршчэўская, А. Л. Арфаграфічны слоўнік беларускай мовы / А. Л. Баршчэўская, Л. П. Баршчэўскі. – 4-е выд. – Мінск : Радыела-плюс, 2018. – 559 с.
3. Беларуская лексіка і граматыка: моўная стыхія і моўная норма : дапам. для студэнтаў філал. спецыяльнасцей, выкладчыкаў і інш. / І. І. Караткевіч [і інш.]. – Кіеў : Ліра-К, 2018. – 139 с.
4. Бондал, І. В. Сучасная беларуская мова. Лексіка. Фразеалогія. Фанетыка. Арфаэпія. Графіка. Арфаграфія : тэставыя заданні / І. В. Бондал, В. Э. Зіманскі. – Віцебск : Віцеб. дзярж. ўн-т, 2016. – 54 с.
5. Даведнік па літаратурнай праўцы: арфаграфічны, пунктуацыйны, лексічны, марфалагічны, сінтаксічны, тэхнічны ўзроўні / П. П. Жаўняровіч ; уступ. слова В. Іўчанкава ; пад рэд. В. Іўчанкава. – Мінск : Адукацыя і выхаванне, 2017. – 448 с.
6. Караткевіч, І. І. Сучасная беларуская мова. Лексікалогія. Лексікаграфія. Фразеалогія : вучэб. дапам. / І. І. Караткевіч. – Кіеў : Ліра-К, 2019. – 139 с.
7. Клундук, С. С. Беларуская мова: усе складаныя тэмы / С. С. Клундук, Н. Р. Якубук. – 2-е выд. – Мінск : Аверсэв, 2016. – 128 с.
8. Кныш, Л. С. Практыкум па беларускай мове / Л. С. Кныш, В. У. Барысенка, Т. Г. Казакевіч. – Мінск : Мін. дзярж. лінгвіст. ун-т, 2020. – 239 с.

9. Куліковіч, У. І. Сучасная беларуская арфаграфія. Правілы. Трэніровачныя заданні. Кантрольныя работы. Заліковыя тэсты. Даведкі : вучэб. дапам. / У. І. Куліковіч. – Мінск : Новое знание, 2011. – 507 с.

10. Купрысь, П. Д. Вялікі беларуска-рускі слоўнік = Большой русско-белорусский словарь / П. Д. Купрысь, Д. М. Яндальцаў. – Мінск : Харвест, 2021. – 576 с.

11. Лепешаў, І. Я. Практыкум па беларускай мове : вучэб. дапам. для студэнтаў філал. спецыяльнасцей ВНУ / І. Я. Лепешаў, Г. М. Малажай, К. М. Панюціч. – 2-е выд., папраўл. і дап. – Мінск : Выш. шк., 2010. – 332 с.

12. Маршэўская, В. В. Семантычная і граматычная характарыстыка фразеалагізмаў са структурай сказа : манаграфія / В. В. Маршэўская. – Гродна : ЮрСаПрынт, 2019. – 121 с.

13. Маршэўская, В. В. Сучасная беларуская мова. Сінтаксіс : вучэб. дапам. для студэнтаў ВНУ / В. В. Маршэўская. – Гродна : Гродзен. дзярж. ун-т, 2015. – 279 с.

14. Сучасная беларуская літаратурная мова : вучэб. дапам. для студэнтаў ВНУ / Д. В. Дзятко [і інш.]. – 2-е выд., папраўл. і дап. – Мінск : Выш. шк., 2020. – 588 с.

15. Тлумачальны слоўнік беларускай літаратурнай мовы / уклад.: І. Л. Капылоў [і інш.] ; пад рэд. І. Л. Капылова. – Мінск : Беларус. Энцыкл., 2016. – 968 с.

16. Энциклопедия для школьников и студентов : в 12 т. / пад агул. рэд. Д. В. Дзятко. – Мінск : Беларус. Энцыкл., 2017. – Т. 7 : Беларуская мова. – 495 с.

## Метады навучання

Найбольш эфектыўнымі педагагічнымі методыкамі і тэхналогіямі, што садзейнічаюць уключэнню студэнтаў у пошук і кіраванне ведамі, набыццю вопыту самастойнага вырашэння разнастайных задач, з'яўляюцца:

– тэхналогія вучэбна-даследчай дзейнасці;
– тэхналогія праблемна-модульнага навучання;
– праектныя тэхналогіі;
– камунікатыўныя тэхналогіі і інш.

Для кіравання вучэбным працэсам і арганізацыі кантрольна-ацэначнай дзейнасці педагогам рэкамендуецца выкарыстоўваць рэйтынгавыя, крэдытна-модульныя сістэмы ацэнкі вучэбнай і даследчай дзейнасці студэнтаў, вучэбна-метадычныя комплексы.

З мэтай фарміравання сучасных сацыяльна-асобасных і сацыяльна-прафесійных кампетэнцый выпускнікоў ВНУ ў практыку правядзення семінарскіх і практычных заняткаў мэтазгодна ўкараняць методыкі актыўнага навучання і дыскусійныя формы.

## Шкала адзнак

Ацэнка вучэбных дасягненняў студэнтаў, якая вызначаецца паэтапна па канкрэтных тэмах вучэбнай дысцыпліны і ажыццяўляецца кафедрай у адпаведнасці з выбранай ВНУ шкалой адзнак. Для ацэнкі вучэбных дасягненняў студэнтаў прымяняюцца крытэрыі, зацверджаныя Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь.

## Дыягнастычны інструментарый

Для дыягностыкі кампетэнцый, выяўлення вучэбных дасягненняў студэнтаў на прамежкавым і выніковым этапах рэкамендуецца выкарыстоўваць тэсты і тэставыя заданні, рознаўзроўневыя кантрольныя заданні. Прамежкавая форма кантролю – залік (у канцы 1 семестра). Выніковая форма кантролю – залік (у канцы 2 семестра).

## Арганізацыя самастойнай работы студэнтаў

Самастойная работа студэнтаў арганізуецца дэканатамі, кафедрамі, выкладчыкамі ВНУ ў адпаведнасці з Палажэннем аб самастойнай працы студэнтаў.

Самастойная работа студэнтаў прадугледжвае выкананне кантрольных і тэставых заданняў, падрыхтоўку вусных паведамленняў і пісьмовых рэфератаў па вызначанай тэматыцы, знаёмства з навуковай, навукова-папулярнай літаратурай, рэфераванне і анатаванне прафесійна арыентаваных тэкстаў і інш.

# Патрабаванні да самастойнай працы студэнтаў

| № п/п | Назва тэмы, раздзела | Колькасць гадзін на СПС | Заданне | Форма выканання |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Функцыянальна-стылявая дыферэнцыяцыя беларускай літаратурнай мовы | 2 | Знайсці тэксты, што рэпрэзентуюць гутарковы, навуковы, публіцыстычны, афіцыйны, мастацкі стылі, скласці табліцу супастаўлення розных тэкстаў згодна з самастойна абранымі крытэрыямі | Пісьмовае заданне (табліца) |
| 2 | Метафара, метанімія, сінекдаха | 2 | Выпісаць прыклады метафары, метаніміі, сінекдахі з мастацкай літаратуры і СМІ, ахарактарызаваць іх стылістычную ролю | Пісьмовае заданне (табліца) |
| 3 | Антонімы як лексічная аснова стылістычных фігур кантрасту (антытэза, аксюмаран) | 2 | Выпісаць прыклады антытэзы і аксюмарана з мастацкай літаратуры, СМІ, ахарактарызаваць іх стылістычную ролю | Пісьмовае заданне (табліца) |
| 4 | Тэрміналагічная лексіка | 2 | Падрыхтаваць даклады і прэзентацыі пра тэрміналогію пэўнай галіны навукі, ахарактарызаваць структуру слоўнікавага артыкула ў лінгвсітычным слоўніку (на выбар) | Прэзентацыя, вуснае паведамленне, пісьмовае заданне |
| 5 | Фразеалагічны аналіз | 2 | Ажыццявіць супастаўляльны аналіз саматычных фразеалагізмаў беларускай мовы і замежнай мовы | Пісьмовае заданне (табліца) |
| 6 | Сістэма гукаў. Акустычны аспект вывучэння гукаў. Фізічныя ўласцівасці гукаў (сіла, вышыня, працягласць) | 2 | Падрыхтаваць даклады, відэаролікі і прэзентацыі на тэму "Уздзеянне розных гукаў на арганізм чалавека" | Прэзентацыя, вуснае паведамленне, відэаролік |
| 7 | Кансанантызм | 2 | Падрыхтаваць практыкаванні на супастаўленне літар і гукаў у | Лінгвамета-дычныя |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| | | | слове | заданні ў сістэме LearningApps |
| 8 | Асаблівасці фанетыкі беларускай мовы ў параўнанні з рускай мовай і правілы перадачы іх на пісьме | 2 | Падрыхтаваць вусныя выступленні (сінхронны пераклад) у міні-групах, накіраваныя на рэпрэзентацыю асаблівасцей фанетычных асаблівасцей беларускай мовы ў параўнанні з рускай | Вусныя выступленні ў міні-групах |
| 9 | Маўленчая культура носьбіта мовы | 2 | Падрыхтавацца да дыскусійнай гутаркі па тэме "Лінгвстычныя сакрэты паспяховага вуснага выступлення" | Дыскусійная гутарка "Лінгвістычныя сакрэты паспяховага вуснага выступлення" |
| 10 | Змены і ўдакладненні ў беларускім правапісе | 2 | Ажыццявіць параўнальны аналіз правілаў беларускай арфаграфіі і пунктуацыі 1959 г. і 2008 г. | Пісьмовае заданне (табліца) |
| 11 | Правапіс літар, якія абазначаюць глухія і звонкія, шыпячыя і свісцячыя зычныя | 2 | Падрыхтаваць практыкаванні для замацавання правапісу літар, якія абазначаюць глухія і звонкія, шыпячыя і свісцячыя зычныя, і прапанаваць іх аднагрупнікам | Лінгвамета-дычныя заданні ў сістэме LearningApps |
| 12 | Ужыванне вялікай літары | 2 | Знайсці ілюстрацыі правапісу вялікай літары ў СМІ, мастацкіх тэкстах перыяду да 2008 г. і перыяду 2010-2020 гг., разгледзець адрозненні | Пісьмовае заданне (табліца) |
| 13 | Афіксоіды | 2 | Падрыхтаваць даклады і прэзентацыі на тэму "Афіксоіды: лінгвістычны аналіз, гісторыя даследавання" | Вусныя выступленні |
| 14 | Лексіка-семантычны спосаб утварэння | 2 | Падрыхтавацца да праблемнай дыскусіі на тэму "Лексіка-семантычны спосаб: кампетэнцыя дэрываталогіі ці лексікалогіі?" | Праблемная дыскусія на тэму "Лексіка-семантычны спосаб: кампетэнцыя дэрывата-логіі ці лексікало-гіі?" |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| 15 | Часціны мовы | 2 | Падрыхтаваць даклады і прэзентацыі на тэму "Прынцыпы класіфікацыі слоў па часцінах мовы" | Вусныя выступленні |
| 16 | Назоўнік | 2 | Падабраць тэкст і размеркаваць усе назоўнікі, што сустракаюцца ў абраным тэксце, па лексіка-семантычных групах | Пісьмовае заданне |
| 17 | Скланенне імёнаў, прозвішчаў, геаграфічных назваў | 2 | Знайсці на беларускамоўных сайтах імёны, прозвішчы, геаграфічныя назвы і прааналізаваць іх скланенне | Пісьмовае заданне |
| 18 | Формы назоўнікаў з суфіксамі суб'ектыўнай ацэнкі. | 2 | Знайсці прыклады назоўнікаў з суфіксамі суб'ектыўнай ацэнкі ў беларускім N-корпусе | Пісьмовае заданне |
| 19 | Форма элятыва | 2 | Супаставіць асаблівасці формы элятыва ў беларускай і рускай мовах | Пісьмовае заданне (табліца) |
| 20 | Формы прыметнікаў са значэннем суб'ектыўнай ацэнкі і меры якасці | 2 | Знайсці прыклады прыметнікаў са значэннем суб'ектыўнай ацэнкі і меры якасці ў беларускім N-корпусе, абазначыць мэту іх ужывання | Пісьмовае заданне |
| 21 | Адрозненне лічэбнікаў ад назоўнікаў СА значэннем ліку | 2 | Падрыхтаваць супастаўляльную табліцу, якая ілюструе адрозненні лічэбнікаў ад назоўнікаў са значэннем ліку | Пісьмовае заданне (табліца) |
| 22 | Няпэўна-колькасныя словы | 2 | Падрыхтаваць супастаўляльную табліцу, якая ілюструе адрозненні паміж лічэбнікамі і няпэўна-колькаснымі словамі | Пісьмовае заданне (табліца) |
| 23 | Займеннікі як самая ўжывальная ў мове група слоў | 2 | Падрыхтавацца да міні-канферэнцыі ў межах групы на тэму "Чаму займеннікі - самая ўжывальная ў мове група слоў?" | Канферэнцыя ў межах групы |
| 24 | Дзеяслоў як самая багатая на граматычныя катэгорыі часціна мовы | 2 | Падрыхтаваць даклады і прэзентацыі на тэмы "Багацце граматычных катэгорый дзеяслова", "Вербацэнтрызм" | Вусныя паведамленні |
| 25 | Спалучэнне асаблівасцей дзеяслова і | 2 | Складсці табліцу, якая ілюструе спалучэнне асаблівасцей дзеяслова і прыметніка ў | Пісьмовае заданне (табліца) |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| | прыметніка ў дзеепрыметніку | | дзеепрыметніку | |
| 26 | Сістэма сродкаў замены не ўласцівых беларускай мове дзеепрыметнікаў пры перакладзе з рускай мовы | 2 | Супаставіць арыгінальныя рускія тэксты і іх пераклады на беларускую мову (СМІ, мастацкая літаратура) | Пісьмовае заданне (табліца) |
| 27 | Дзеепрыслоўны зварот | 2 | Выпісаць дзеепрыслоўныя звароты з тэкстаў СМІ і мастацкай літаратуры і прааналізаваць іх пунктуацыйнае афармленне | Пісьмовае заданне |
| 28 | Адрозненне прыслоўяў ад безасабова-прэдыкатыўных слоў | 2 | Выпісаць з мастацкай літаратуры, СМІ або беларускага N-корпуса прыклады ўжывання прыслоўяў і безасабова-прэдыкатыўных слоў | Пісьмовае заданне (табліца) |
| 29 | Асаблівасці ўжывання прыназоўнікаў у беларускай мове | 2 | Выпісаць з мастацкай літаратуры, СМІ або беларускага N-корпуса прыклады, якія ілюструюць асаблівасці ўжывання прыназоўнікаў у беларускай мове, перакласці гэтыя прыклады на рускую мову | Пісьмовае заданне |
| 30 | Адрозненне гукапераймальных слоў ад выклічнікаў | 2 | Скласці табліцу, якая ілюструе адрозненне гукапераймальных слоў ад выклічнікаў | Пісьмовае заданне (табліца) |
| 31. | Асаблівасці кіравання ў беларускай мове (у параўнанні з рускай) | 2 | Скласці табліцу, якая ілюструе асаблівасці кіравання ў беларускай мове (у параўнанні з рускай) | Пісьмовае заданне (табліца) |
| 32 | Сказ як адзінка найвышэйшага сінтаксічнага ўзроўню мовы. Камунікатыўная функцыя сказа | 2 | Падрыхтаваць даклады і прэзентацыі на тэмы "Сказ як адзінка найвышэйшага сінтаксічнага ўзроўню мовы", "Камунікатыўная функцыя сказа" | Вусныя паведамленні, прэзентацыі |
| 33 | Інверсія і яе стылістычная роля | 2 | Скласці сказы з інверсіяй і ахарактарызаваць яе стылістычную ролю | Пісьмовае заданне |
| 34 | Адасабленне як спецыфічны сродак | 4 | Выпісаць з тэкстаў мастацкай літаратуры, СМІ адасобленыя | Пісьмовае заданне |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| | сінтаксічнай сувязі слоў у сказе. Сказы з адасобленымі членамі | | канструкцыі і ахарактарызаваць іх стылістычны патэнцыял | |
| 35 | Пабочныя і ўстаўныя канструкцыі | 2 | Прааналізаваць асаблівасці ўжывання пабочных і ўстаўных канструкцый у вусным маўленні (інтэрв'ю, гутарка, маналог) | Вуснае абмеркаванне |
| 36 | Перыяд. Складанае сінтаксічнае цэлае | 2 | Заканспектаваць матэрыял, прысвечаны перыяду, у лінгвістычных слоўніках, даведніках | Канспект |
| 37 | Няўласна-простая мова | 2 | Скласці тэкст з элементамі няўласна-простай мовы, прааналізаваць мэты ўвядзення няўласна-простай мовы ў маўленне | Пісьмовае заданне |
| 38 | Інтанацыя як дадатковы паказчык ужывання знакаў прыпынку | 2 | Падрыхтаваць тэксты для дыктантаў і прапанаваць урыўкі з іх пад запіс аднагрупнікам. Прааналізаваць ролю інтанацыі ў выбары знакаў прыпынку пры напісанні дыктантаў | Пісьмовае заданне лінгваме-тадычнага характару |
| 39 | Афармленне і напісанне заявы, распіскі, акта, даверанасці, аўтабіяграфіі, пратакола | 2 | Напісаць на выбар афіцыйную паперу, абмеркаваць іх практычную значнасць, задзейнічаныя моўныя сродкі | Пісьмовае заданне, вуснае абмеркаванне |

# Пералік тэарэтычных пытанняў да заліку па дысцыпліне “Практыкум па беларускай мове”

## 1 семестр

1. Уводзіны. Змест і задачы курса “Практыкум па беларускай мове”, яго месца ў сістэме лінгвістычных дысцыплін. Роля курса ў фарміраванні і развіцці сацыяльна-асобасных і сацыяльна-прафесійных кампетэнцый выпускнікоў ВНУ.
2. Слова, фразеалагізм. Асноўныя правілы слова- і фразеўжывання. Сутнасць слова, яго месца сярод іншых адзінак мовы, значэнне і паняцце, суадносіны лексічнага і граматычнага значэнняў у слове. Крытэрыі вылучэння слова. Лексема. Словаформа.
3. Полісемія. Размежаванне мнагазначных слоў і амонімаў. Амонімы як стылістычны сродак стварэння каламбураў.
4. Паронімы. Стылістычныя памылкі, звязаныя з ужываннем амонімаў і паронімаў.
5. Сінонімы, іх функцыя ў мове. Сінанімічны рад. Лексічныя дублеты (абсалютныя сінонімы).
6. Антанімія. Антонімы як лексічная аснова стылістычных фігур кантрасту (антытэза, аксюмаран). Лексічная інтэрферэнцыя.
7. Фразеалагічныя адзінкі і іх ужыванне ў мове. Асаблівасці фразем.
8. Фразеалагізм і слова. Фразеалагізм і словазлучэнне. Фразеалагізм і сказ. Крытэрыі фразеалагічнасці. Перыфраза.
9. Афарызмы. Крылатыя словы
10. Галосныя і зычныя гукі і іх характарыстыка. Вакалізм. Класіфікацыя галосных гукаў (паводле ступені і месца пад’ёму языка, удзелу губ).
11. Кансанантызм. Класіфікацыя зычных гукаў (паводле ўдзелу голасу і шуму, спосабу і месца ўтварэння, адсутнасці або наяўнасці палаталізацыі, працягласці).
12. Асаблівасці фанетыкі беларускай мовы (аканне, яканне, дзеканне, цеканне, прыстаўныя, падоўжаныя гукі і інш.) у параўнанні з рускай мовай і правілы перадачы іх на пісьме.
13. Чаргаванні гукаў (жывыя (пазіцыйныя) і гістарычныя (традыцыйныя)).
14. Гукі і літары. Алфавіт. Суадносіны паміж літарамі і гукамі. Абазначэнне мяккасці зычных на пісьме.
15. Асноўныя правілы вымаўлення галосных, зычных і спалучэнняў зычных. Асноўныя прычыны парушэння арфаэпічных нормаў. Маўленчая культура носьбіта мовы.
16. Асноўныя прынцыпы беларускай арфаграфіі. Змены і ўдакладненні ў беларускім правапісе (Закон «Аб Правілах беларускай арфаграфіі і пунктуацыі» ад 23 ліпеня 2008 года (уступіў у сілу 1 верасня 2010 года)).
17. Правапіс галосных *о, э, а*; *е, ё, я*. Правапіс спалучэнняў *іо (ыо), іё (ыё), ія (ыя), іе (ые)* у запазычаных словах.
18. Правапіс *у, ў*.

19. Правапіс д-дз, т-ц.

20. Правапіс змякчальнага мяккага знака.

21. Правапіс раздзяляльнага мяккага знака і апострафа.

22. Напісанне слоў разам, праз злучок і асобна.

23. Ужыванне вялікай літары. Агульныя правілы правапісу вялікаи□ і малои□ літар. Новае ў правапісе вялікай і малой літар (пасля прыняцця Закона «Аб Правілах беларускай арфаграфіі і пунктуацыі» ад 23 ліпеня 2008 года (уступіў у сілу 1 верасня 2010 года)).

24. Правілы пераносу слоў. Правілы скарачэння слоў.

Арфаграфічны аналіз.

25. Корань, варыянты кораня (свабодныя і звязаныя карані); афіксы: прыстаўка, суфікс, постфікс, інтэрфікс.

26. Тыпы афіксаў паводле функцыі: словаўтваральныя, формаўтваральныя і сінкрэтычныя (словаформаўтваральныя). Афіксоіды.

27. Правапіс прыставак. Правапіс *і, ы, й* пасля прыставак.

28. Марфемны аналіз. Спосабы ўтварэння слоў (марфалагічны (афіксацыя, кампазіцыя, кампазіцыя+афіксацыя), марфалагічна-сінтаксічны, лексічна-сінтаксічны, лексіка-семантычны). Вытворнае слова. Словаўтваральны ланцужок. Словаўтваральнае значэнне.

29. Правапіс галосных у складаных словах, правапіс складанаскарочаных слоў. Напісанне абрэвіятур. Новае ў правапісе галосных у складаных словах (пасля прыняцця Закона «Аб Правілах беларускай арфаграфіі і пунктуацыі» ад 23 ліпеня 2008 года (уступіў у сілу 1 верасня 2010 года)). Словаўтваральны аналіз.

30. Часціны мовы. Прынцыпы класіфікацыі слоў па часцінах мовы. Пераходнасць у сістэме часцін мовы. Зменлівасць часцін мовы. Самастойныя і службовыя часціны мовы. Марфалагічны аналіз слоў розных часцін мовы.

31. Назоўнік. Катэгарыяльнае значэнне прадметнасці ў назоўнікаў. Лексічна-семантычныя групы назоўнікаў. Лексіка-граматычныя разрады назоўнікаў. Марфалагічны аналіз назоўнікаў.

32. Правапіс склонавых канчаткаў назоўнікаў першага скланення (у давальным і месным склонах).

33. Правапіс склонавых канчаткаў назоўнікаў другога скланення (у родным і месным склонах).

34. Правапіс склонавых канчаткаў назоўнікаў трэцяга скланення.

35. Правапіс канчаткаў назоўнікаў множнага ліку.

36. Правапіс канчаткаў рознаскланяльных назоўнікаў.

37. Нескланяльныя назоўнікі. Скланенне імёнаў, прозвішчаў, геаграфічных назваў. Правапіс суфіксаў назоўнікаў.

38. Правапіс складаных назоўнікаў. Формы назоўнікаў з суфіксамі суб'ектыўнай ацэнкі.

39. Словаўтварэнне назоўнікаў. Субстантывацыя.

40. Прыметнік. Катэгарыяльнае значэнне прыметы ў прыметнікаў. Разрады прыметнікаў. Марфалагічны аналіз прыметнікаў.

41. Утварэнне і ўжыванне формаў ступеняў параўнання якасных прыметнікаў. Форма элятыва.

42. Выражэнне прыналежнасці ў беларускай мове. Уласнапрыналежныя і агульнапрыналежныя прыметнікі.

43. Пераход прыметнікаў з аднаго тыпу ў іншы. Правапіс суфіксаў прыметнікаў.

44. Правапіс складаных прыметнікаў.

45. Кароткая і сцягнутая формы прыметнікаў. Формы прыметнікаў са значэннем суб'ектыўнай ацэнкі і меры якасці.

46. Словаўтварэнне прыметнікаў. Ад'ектывацыя.

47. Лічэбнік. Катэгарыяльнае значэнне колькасці ў лічэбніках. Марфалагічны аналіз лічэбнікаў. Паняцце пра колькасна-іменнае спалучэнне. Адрозненне лічэбнікаў ад назоўнікаў са значэннем ліку *(двойка, тройка, сотня, трэць і інш.)*.

48. Скланенне і правапіс колькасных і парадкавых лічэбнікаў.

49. Асаблівасці сінтаксічнай сувязі лічэбнікаў з назоўнікамі.

50. Няпэўна-колькасныя словы.

# Пералік тэарэтычных пытанняў да заліку па дысцыпліне “Практыкум па беларускай мове”

## 2 семестр

1. Займеннікі як самая ўжывальная ў мове група слоў. Разрады займеннікаў. Асаблівасці ўжывання некаторых займеннікаў. Скланенне і правапіс займеннікаў. Словаўтварэнне займеннікаў. Пранаміналізацыя. Марфалагічны аналіз займеннікаў.

2. Дзеяслоў як самая багатая на граматычныя катэгорыі часціна мовы. Катэгарыяльнае значэнне працэсу ў дзеясловаў. Марфалагічны аналіз дзеясловаў. Інфінітыў.

3. Асабовыя канчаткі дзеясловаў і іх правапіс.

4. Адрозненне формы дзеясловаў 1-й асобы множнага ліку абвеснага ладу ад формы 1-й асобы загаднага ладу (*бяром – бярэм, нясём – нясем, сцеражом – сцеражэм*). Формы дзеясловаў 2-й асобы множнага ліку абвеснага ладу з націскнымі канчаткамі (*бераце, ідзяце, сцеражаце*). Вызначэнне націску ў дзеясловах 2-й асобы множнага ліку. Правапіс суфіксаў дзеясловаў. Словаўтварэнне дзеясловаў.

5. Дзеепрыметнік як форма дзеяслова. Спалучэнне асаблівасцей дзеяслова і прыметніка ў дзеепрыметніку. Марфалагічны аналіз дзеепрыметнікаў. Утварэнне і ўжыванне дзеепрыметнікаў. Правапіс суфіксаў дзеепрыметнікаў.

6. Поўныя і кароткія дзеепрыметнікі. Дзеепрыметны зварот. Пераклад дзеепрыметнікаў з рускай мовы на беларускую. Сістэма сродкаў замены не ўласцівых беларускай мове дзеепрыметнікаў пры перакладзе з рускай мовы. Пераход дзеепрыметнікаў у прыметнікі.

7. Дзеепрыслоўе як форма дзеяслова. Спалучэнне асаблівасцей дзеяслова і прыслоўя ў дзеепрыслоўі. Марфалагічны аналіз дзеепрыслоўяў. Утварэнне і ўжыванне дзеепрыслоўяў. Дзеепрыслоўны зварот. Правапіс суфіксаў дзеепрыслоўяў. Пераход дзеепрыслоўяў у прыслоўі.

8. Прыслоўе. Нязменнасць як асноўная марфалагічная прымета прыслоўя. Марфалагічны аналіз прыслоўяў. Утварэнне і ўжыванне формаў ступеняў параўнання якасных прыслоўяў. Правапіс прыслоўяў. Правапіс спалучэнняў, блізкіх да прыслоўяў.

9. Формы прыслоўяў са значэннем ацэнкі і меры якасці. Невытворныя і вытворныя прыслоўі. Адвербіялізацыя. Безасабова-прэдыкатыўныя словы. Адрозненне прыслоўяў ад безасабова-прэдыкатыўных слоў.

10. Марфалагічны аналіз прыназоўнікаў, злучнікаў, часціц. Правапіс прыназоўнікаў. Адрозненне прыназоўнікаў ад слоў іншых граматычна-семантычных класаў. Асаблівасці ўжывання прыназоўнікаў у беларускай мове.

11. Правапіс злучнікаў. Адрозненне злучнікаў ад слоў іншых часцін мовы. Правапіс часціц.

12. Правапіс *не* (*ня*), *ні* з рознымі часцінамі мовы.

13. Ужыванне часціц *не* і *ні*. Выкарыстанне часціц у словаўтварэнні.

14. Адметнасць выклічніка як часціны мовы. Марфалагічны аналіз выклічнікаў. Адрозненне выклічнікаў ад самастойных і службовых часцін мовы. Адрозненне гукаперaймальных слоў ад выклічнікаў. Правапіс выклічнікаў і гукаперaймальных слоў і знакі прыпынку пры іх. Гукаперайманні як аснова для ўтварэння новых слоў.

15. Мадальныя словы. Месца мадальных слоў у сістэме часцін мовы.

16. Словазлучэнне. Прыметы словазлучэння. Адрозненне словазлучэння ад слова і сказа. Свабодныя і несвабодныя словазлучэнні. Віды сувязі слоў у словазлучэнні. Ужыванне прыназоўнікавых канструкцый.

17. Асаблівасці кіравання ў беларускай мове (у параўнанні з рускай). Спецыфічныя словазлучэнні ў беларускай мове. Сінтаксічны аналіз словазлучэння.

18. Просты сказ. Прыметы сказа (граматычная афармленасць, прэдыкатыўнасць, мадальнасць, сэнсавая завершанасць, інтанацыйная закончанасць). Сказ як адзінка найвышэйшага сінтаксічнага ўзроўню мовы. Камунікатыўная функцыя сказа. Сінтаксічны аналіз простага сказа.

19. Двухсастаўныя і аднасастаўныя сказы. Няпоўныя сказы. Словы-сказы. Галоўныя і даданыя члены сказа, іх выражэнне. Марфалагізаваныя і немарфалагізаваныя члены сказа.

20. Каардынацыя дзейніка і выказніка. Размежаванне членаў сказа.

21. Дапаўненне. Азначэнне. Прыдатак як разнавіднасць дапасаванага азначэння. Сінкрэтызм у сістэме даданых членаў сказа. Парадак слоў у сказе. Інверсія і яе стылістычная роля.

22. Працяжнік паміж дзейнікам і выказнікам. Працяжнік у няпоўным сказе.

23. Аднародныя члены сказа. Прыметы аднароднасці членаў сказа. Віды сувязі паміж аднароднымі членамі сказа. Аднародныя і неаднародныя азначэнні.

24. Абагульняльныя словы пры аднародных членах сказа. Знакі прыпынку пры аднародных членах сказа.

25. Адасабленне як спецыфічны сродак сінтаксічнай сувязі слоў у сказе. Сказы з адасобленымі членамі. Адасобленыя азначэнні.

26. Адасобленыя прыдаткі.

27. Адасобленыя дапаўненні.

28. Адасобленыя акалічнасці.

29. Адасабленне далучальных канструкцый. Факультатыўнае адасабленне даданых членаў сказа.

30. Знакі прыпынку пры параўнальных зваротах. Адрозненне параўнальнага звароту ад даданай параўнальнай часткі складаназалежнага сказа.

31. Пабочныя і ўстаўныя канструкцыі. Адрозненне пабочных канструкцый ад аманімічных непабочных.

32. Устаўныя канструкцыі. Адрозненне ўстаўных канструкцый ад іншых сінтаксічных адзінак. Знакі прыпынку пры пабочных і ўстаўных канструкцыях.

33. Зваротак. Спосабы выражэння звароткаў. Знакі прыпынку пры звротках, якія стаяць у пачатку, у сярэдзіне і ў канцы сказа. Знакі прыпынку пры звротках, якія ўжываюцца з часціцамі і асабовымі займеннікамі.

34. Парцэляцыя як сінтаксічная з'ява.

35. Складаны сказ. Сінтаксічны аналіз складанага сказа. Тыпы складаных сказаў. Сродкі выражэння сувязі і адносін паміж часткамі складанага сказа.

36. Тыпы складаназлучаных сказаў і знакі прыпынку ў іх.

37. Тыпы складаназалежных сказаў і знакі прыпынку ў іх.

38. Складаназалежныя сказы з даданымі азначальнымі часткамі.

39. Складаназалежныя сказы з даданымі дзейнікавымі часткамі.

40. Складаназалежныя сказы з даданымі выказнікавымі часткамі.

41. Складаназалежныя сказы з даданымі дапаўняльнымі часткамі.

42. Складаназалежныя сказы з даданымі акалічнаснымі часткамі.

43. Складаназалежныя сказы з некалькімі даданымі часткамі, знакі прыпынку ў іх.

44. Бяззлучнікавыя складаныя сказы, знакі прыпынку ў іх.

45. Складаныя сказы з living рознымі відамі сувязі, знакі прыпынку ў іх.

46. Перыяд. Складанае сінтаксічнае цэлае.

47. Простая і ўскосная мова. Формы простай мовы (рэпліка, маналог, дыялог, палілог). Аўтарская і простая мова. Знакі прыпынку ў сказах з простай мовай. Афармленне дыялога. Паўпростая мова. Няўласна-простая мова. Знакі прыпынку пры цытаванні.

48. Пунктуацыя. Роля пунктуацыі ў афармленні пісьмовай мовы. Інтанацыя як дадатковы паказчык ужывання знакаў прыпынку. Знакі прыпынку і іх тыпы (выдзяляльныя, раздзяляльныя, поліфункцыянальныя). Спалучэнне знакаў прыпынку і “паглынанне” адных знакаў другімі.

49. Нарматыўныя, варыянтныя, факультатыўныя, аўтарскія знакі прыпынку. Мнагазначнасць знакаў прыпынку. Пунктуацыйны аналіз.

50. Афіцыйныя паперы. Віды афіцыйных папер і агульныя патрабаванні да іх. Афармленне і напісанне заявы, распіскі, акта, даверанасці, аўтабіяграфіі, пратакола і інш.

# ПРАТАКОЛ УЗГАДНЕННЯ ВУЧЭБНАЙ ПРАГРАМЫ

| Назва вучэбнай дысцыпліны, з якой патрабуецца ўзгадненне | Назва кафедры | Прапановы аб зменах у змесце вучэбнай праграмы ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне | Рашэнне, прынятае кафедрай, што распрацавала вучэбную праграму |
|---|---|---|---|
| "Сучасная беларуская літаратурная мова," "Культура маўлення", "Стылістыка беларускай мовы" | мовазнаўства і лінгвадыдактыкі | Дубліраванне вучэбнага матэрыялу і неістотныя супярэчнасці паміж праграмамі ліквідаваны на этапе распрацоўкі вучэбнай праграмы | Пратакол № 12 ад 25.06.2021 г. |